**“Виртуальная реконструкция библиотеки рода Сапег” (2010–2011 гг.)**

Міжнародны навукова-даследчы праект выкананы на працягу жніўня 2010 г. – лютага 2011 г. Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі ў супрацоўніцтве з Расійскай нацыянальнай бібліятэкай і Брэсцкай абласной бібліятэкай імя М. Горкага пры фінансавай падтрымцы Бюро ЮНЕСКА ў Маскве. Мэта праекта – комплекснае вывучэнне і ўвядзенне ў навуковы абарот кнігазбораў роду Сапегаў. Вынікамі праекта з’явіліся: 1) стварэнне і правядзенне першага пасяджэння Міжнароднага савета па развіцці праекта віртуальнай рэканструкцыі бібліятэкі роду Сапегаў з удзелам спецыялістаў з Беларусі, Расіі, Польшчы і Літвы; 2) выпуск і прэзентацыя электроннага выдання “Сапегіяна: кнігазбор роду Сапегаў”, якое ўключае каталог кніг, што належалі раней зборам Сапегаў (303 дакументы), паўнатэкставыя электронныя копіі найбольш каштоўных выданняў (53 дакументы), а таксама навуковыя і бібліяграфічныя матэрыялы па гісторыі роду і яго бібліятэк. Праект накіраваны на захаванне найбагацейшай кніжнай спадчыны Сапегаў, якая мае не толькі нацыянальнае, але і агульнаеўрапейскія значэнне, а таксама на прадастаўленне доступу да дакументаў, якія захоўваюцца ў складзе гэтай каштоўнай гістарычнай калекцыі.